Брэст, Белостоцкая 42 архіўнаму аддзелу



ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 21 (41) Субота 26 мая 1945 г.

ПРАЦОЎНЫЯ КОСАЎСКАГА РАЁНА! НАКІРУЕМ УСЕ СІЛЫ НА АДНАЎЛЕННЕ РАЗБУРАНАЙ ВОРАГАМ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ, ХУТЧЭЙ АДРОДЗІМ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ І КУЛЬТУРНЫЯ ЎСТАНОВЫ, ПОЎНАСЦЮ АДБУДУЕМ ВЁСКІ, СПАЛЕНЫЯ ВОРАГАМІ

## БОЛЬШ УВАГІ БУДАЎНІЦТВУ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ

Нямецка-фашысцкія варвары у перыяд акупацыі нашай рэспублікі чынілі жудасныя расправы над мірным насельніцтвам. Яны ставілі сваёй задачай знішчэнне значнай часткі беларускага народа, а астальную частку ператварыць у пакорных рабоў нямецкіх памешчыкаў і баронаў. З жорсткасцю сярэднявяковых варвараў расправляліся я н ы з нашымі людзьмі: расстрэльвалі, вешалі, палілі жывымі на агні, уганялі ў нямецкае рабства.

На тэрыторыі нашага раёна немцы спалілі 2317 жылых дамоў. Такія вёскі як Жытлін, Корачын, Зыбайлы, Яблонка, Була вусім знесены з твару зямлі. Дзесяткі людзей загінулі ў полымі пажараў.

Але нямецкім душагубам не ўдалося пакарыць беларускі народ. Пры дапамозе вялікага рускага народа і другіх народаў Савецкага Саюза Беларусь зноў стала вольнай краінай. Фашысцкая Германія, пасягаўшая на незалежнасць нашай Радзімы, разгромлена і капітулявала перад магутнай Чырвонай Арміяй і арміямі нашых саюзнікаў.

«Вялікая Айчынная вайна завяршылася нашай поўнай перамогай. Перыяд вайны ў Еўропе скончыўся. Пачаўся перыяд мірнага развіцця» (Сталін).

Перад партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі арганізацыямі, а таксама перад усімі працоўнымі раёна стаіць адказнейшая задача —хутчэй залячыць раны, нанесеныя вайной гаспадарцы раёна, аднавіць усё разбуранае і спаленае.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на будаўніцтва жылых дамоў у вёсках, спаленых нямецкімі акупантамі. Нельга цярпець такое становішча, калі на працягу ўсяго перыяда з дня вызвалення ў раёне пабудована толькі 528 новых жылых дамоў. У Яглевіцкім сельсовеце з 229 спаленых дамоў новых пабудована 22, а ў Яблонскім сельсовеце з 126 спаленых дамоў новых пабудована толькі 6. Не лепш справа абстаіць і ў другіх сельсоветах.

Для паспяховага аднаўлення вёсак, знішчаных у перыяд акупацыі, у раёне неабходна арганізаваць шырокую вытворчасць будаўнічых матэрыялаў на б а з е мясцовай прамысловасці. У нас ёсць усе магчымасці арганізаваць масавы выпуск цэглы, чарапіцы, гонты, дора, без якіх немысліма будаўніцтва жылых дамоў, аднаўленне прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Аднак кіраўнікі райпромкамбіната чамусьці марудзяць з арганізацыяй такой важнай галіны вытворчасці.

Будаўніцтва жылых дамоў у раёне набывае важнае значэнне тым больш, што многія сем'і жывуць у зямлянках. Мы павінны дабіцца такога становішча, каб да зімы перасяліць усіх, хто яшчэ жыве ў зямлянках, у новыя светлыя дамы. Гэта пачотная задача для партыйных, савецкіх, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый.

## Узятае абавязацельства выконваюць

Комсамольцы і моладзь нашага раёна, жадаючы яшчэ больш дапамагчы Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ворага, нячу... прадвесні ўзялі на сябе абавязацельства засеяць у фонд Чырвонай Арміі плошчу ў 100 га.

Сваё абавязацельства яны з чэсцю выконваюць. Сіламі комсамольцаў і моладзі па раёну ўжо засеяна 73 гектары. 15 га. падрыхтавана для сяўбы познімі яравымі культурамі—грэчкай і просам.

Комсамольцы Гошчаўскай пярвічнай комсамольскай арганізацыі, якія першымі ў вобласці ўзялі ініцыятыву аб пасеве зямлі ў фонд Чырвонай Арміі, сваімі сіламі засеялі 15 га. У іхняй рабоце актыўна дапамагае несаюзная моладзь. Зараз комсамольцы і моладзь рыхтуюць глебу пад позпія яравыя культуры.

Ад 4 да 7 гектараў засеялі ў фонд Чырвонай Арміі Бычанская, Аляксейкаўская, Стайкаўская і Белавіцкая комсамольскія арганізацыі.

Адначасова з сяўбой у фонд абароны Радзімы, комсамольцы актыўна дапамагалі бясконным гаспадаркам. Прыкладам у гэтай справе служаць комсамольцы і моладзь серадаўскай комсамольскай арганізацыі.

Зараз п е р а д комсамольцамі стаіць задача—арганізаваць добры догляд за пасевамі, каб сабраць высокі ўраджай з пасеяных у фонд Чырвонай Арміі участкаў.

К. Шчэглова.

# НЕ ЗАБУДЗЕМ, НЕ ПРОСЦІМ!

## КРЫВАВАЕ ЗЛАЧЫНСТВА НЕМЦАЎ У ВЁСЦЫ ДУБІТАВА

У сялян нашай вёскі надоўга застанецца ў памяці дзень 21 верасня 1942 года. У гэты дзень гітлераўскія палачы і іх крывавыя памочнікі беларуска-нямецкія нацыяналісты ўчынілі крывавую расправу над лепшымі людзьмі нашай вёскі.

Яшчэ пад вечар 20 верасня ў вёску прыехала тры машыны перапоўненых нямецкімі салдатамі і паліцэйскімі. Афіцэр аб'явіў, што ў вёсцы будзе арганізаван адпачынак для нямецкіх салдат. Але назаўтра зранку вёска аказалася акружанай. На скрыжаваннях дарог былі пастаўлены кулямёты.

Прадажныя нямецкія бестыі, п'яніцы і зладзеі солтыс Кулецкі Іван і яго намеснік Радзюк Іосіф вадзілі за сабой ватагу п'яных нямецкіх галаварэзаў, указваючы то на адну, то на другую хату.

Немцы з дзікім крыкам і свістам выганялі з указаных хат іх гаспадароў, да паўсмерці збіваючы старыкоў, жанчын і нават маленькіх дзяцей.

Не прайшло і паўгадзіны, як было сагнана 26 чалавек. Сярод іх былі дэпутаты сельсовета Кулецкі Барыс і Кулецкі Іван са сваімі сем'ямі, актывісты Кулецкі Александр Давыдавіч з жонкай і двумя дзецьмі і Каспяровіч Іван Васільевіч, яго жонка і трое дзяцей і другія.

Немцы акружылі іх п'янай аравай. Моцна збівалі, здзекваліся. Літасці не было ні каму — ні жанчынам, ні дзецям, ні старыкам.

Болем сціскаліся нашы сэрцы гледзячы на страшныя пакуты сваіх аднасяльчан. Мы пакляліся адпомсціць крывавым нямецкім шакалам. Але ў той час мы былі бяссільны прадпрыняць, што-небудзь дзейснае.

Наздзекваўшыся ўволю над сваімі ахвярамі, немцы пагналі іх за вёску і там усіх расстралялі. А затым вярнуўшыся пачалі павальны грабёж кватэр. У гэтай справе ім актыўна дапамагалі солтыс Кулецкі, яго намеснік Радзюк і нямецкі халуй, перакладчык Нехта Нікалайчук з вёскі Чыжыкі, якога потым як шалёнага сабаку расстралялі партызаны.

Ні крывавыя зверствы, ні расстрэлы лепшых нашых людзей, ні ўгон у нямецкае рабства нашай моладзі, ні віселіцы, ні пажары — нішто не дапамагло гітлераўцам пакарыць вялікі савецкі народ, разбіць яго магутную армію. Наадварот гэта прыблізіла дзень разгрома гітлераўскай Германіі. Наша гора, нашы слёзы, наша стойкасць і справядлівасць перамаглі фашысцкую тыранію.

Гітлераўская Германія канчаткова разгромлена, Вялікая Айчынная вайна закончылася нашай поўнай перамогай. Але і зараз мы не забудзем і не просцім гітлераўскім палачам за прычыненае нам гора. Мы іх будзем судзіць справядлівым народным судом і пакараем кожнага па яго заслузе.

Сяляне нашай вёскі, натхнёныя гістарычнай перамогай над ворагам, працуюць на вызваленай зямлі не пакладаючы рук, аддаюць усе сілы на залечванне слуўбы, каб даць краіне больш усяго неабходнага і яшчэ больш умацаваць яе ваенную і эканамічную магутнасць.

С. Паўловіч

в. Дубітава

## Дастаўка газет авіясувяззю

З 20 мая Упраўленне ваенна-грамадзянскага паветранага флота і органы сувязі арганізуюць дастаўку на самалётах газет у Полацкую, Пінскую, Брэсцкую, Палескую, Віцебскую, Магілеўскую абласці і рад раёнаў Мінскай абласці.

Чытачы змогуць атрымаць «Звязду», «Советскую Белоруссию» і іншыя газеты, якія друкуюцца ў Мінску, у дзень іх выхаду, а «Правду», «Известия» і іншыя маскоўскія газеты — на другі і трэці дзень выхаду з друку.

## Стварэнне ў Балгарыі вышэйшага гаспадарчага совета

САФІЯ, 21 мая. (ТАСС). Як перадае балгарскае радыё, пры Совеце міністраў утвараецца Вышэйшы Гаспадарчы Совет, задачай якога з'яўляецца планаванне, рэгуляванне іназіранне за гаспадарчай дзейнасцю дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама за дзейнасцю прыватных і грамадскіх прадпрыемстваў.

## Паланенне фельдмаршала Шэрнера

ЛОНДАН, 21 мая. (ТАСС). Як паведамляе лонданскае радыё, германскі фельдмаршал Шэрнер, які загадаў сваім войскам прадаўжаць супраціўленне совецкім войскам пасля аб'яўлення капітуляцыі Германіі, знаходзіцца ў палоне ў 7-й амерыканскай арміі. Шэрнер на самалёце паляцеў з Чэхаславакіі ў Аўстрыю.

## Напад японскага самалёта на авіяносец „Франклін"

НЬЮ-ЙОРК, 21 мая. (ТАСС). Марское міністэрства ЗША аб'явіла, што 19 мая японскі пікіруючы бамбардыроўшчык у 16 мілях ад узбярэжжа Японіі атакаваў авіяносец «Франклін» водазмяшчэннем у 27 тысяч тон. У выніку двух прамых пападанняў узарваліся ўсе наяўныя на барту боепрыпасы. Забіты 341 і прапалі без вестак 431 чалавек. Ранена больш 300 чалавек. Гэта самыя цяжкія страты, панесеныя якім-небудзь амерыканскім караблём да гэтага часу.

## Паведамленне агенцтва афі

ЛОНДАН, 19 мая (ТАСС). Агенцтва АФІ перадае наступнае паведамленне з Ватыкана: «Некаторыя палітычныя кругі распаўсюджваюць чуткі аб тым, што ваенныя злачынцы, і ў прыватнасці фашысты, якія абвінавачваюцца ў забойстве 320 рымскіх заложнікаў у часе нацысцкай акупацыі, хаваюцца ў Ватыкане. Паводле паведамлення з аўтарытэтнай крыніцы, шасцёра нямецкіх ваенных, якія уцяклі з канцэнтрацыйнага лагера, таксама схаваліся ў Ватыкане».

Адказны рэдактар А. П. Рудой

Г Л 15266 Адрэс рэдакцыі: гарадскі пасёлак Івацэвічы, вул. Шасейная, дом № 11.